# У НОВЫ ГОД БЕЗ ДАЎГОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Калі фарміруецца бюджэт, у першую чаргу закладваюцца грошы, каб не было нястачы прадуктаў харчавання, медыкаментаў... І ўжо потым сродкі накіроўваюцца на развіццё: на набыццё абсталявання, капітальнае будаўніцтва, капрамонт. Гэта бюджэтныя інвестыцыі. Нельга сказаць, што яны маленькія ў мясцовых бюджэтах. Калі параўноўваць, у Еўропе яны складаюць каля 2% ВУП, у нашай краіне — 3,5% — 4% ВУП. А калі мы паглядзім у цэлым на бюджэт дзяржавы, то парадку 2/3 бюджэтных інвестыцый знаходзяцца ў рэгіёнах. Седзячы ў Мінску, не бачна, дзе трэба пабудаваць школу, а дзе — бальніцу. Мясцовым уладам лепш ведаць, куды выдаткаваць грошы.

> На сёння цалкам вольныя ад даўгоў такія гарады, як Гомель, Гродна, Магілёў, Наваполацк і Жодзіна.

***— У органаў мясцовага кіравання і самакіравання ёсць даўгавыя абавязкі. Пастаўскі, Кіраўскі, Пінскі, Брэсцкі, Маларыцкі раёны маюць доўг 60—79% да даходаў бюджэту. Ці можам мы казаць, што гэта праблемныя рэгіёны?***

— Доўг гэтых раёнаў знаходзіцца ў межах параметраў эканамічнай бяспекі. На падставе сусветнай практыкі ў нас у заканадаўстве ўстаноўлены парог бяспекі ў 80% даходаў без уліку сродкаў, што перадаюцца ніжэйстаячым бюджэтам. Але гэтыя раёны знаходзяцца ў зоне рызыкі. Дастаткова прыняць адно рашэнне, каб трапіць у гэтую зону. Так, Пастаўскі раён вырашыў рэканструяваць ільнозавод. А Пінскі, Брэсцкі, Маларыцкі далі гарантыю па крэдыце. Чым гэта небяспечна? У выпадку, калі зніжаюцца даходы, адразу 79% можа тэарэтычна ператварыцца ў 85%. Калі доўг больш за 80%, ёсць рызыка, што для бюджэту будзе вялікая нагрузка. Ён не зможа разлічыцца або па аблігацыі, або па выкананні гарантый. Альбо будзе вымушаны вымыць цалкам усе свае сродкі. Кажучы канкрэтна аб гэтых раёнах — яны ў нас рызыкоўныя, але не крытычныя. Трэба эканоміць, разлічвацца па даўгах, быць больш стрыманымі ў выдатках, на якія не хапае бягучых паступленняў.

Органы мясцовага кіравання і самакіравання ў Беларусі маюць права запазычанняў і прадстаўлення гарантый. Такое права ёсць не ва ўсіх органаў улады ў свеце. Аблігацыі могуць выпускаць толькі абласныя, раённыя і гарадскія выканкамы. Іх трымальнікамі з'яўляюцца банкі. Даходы ад выпуску аблігацый — адна з крыніц фінансавання дэфіцыту бюджэту. Як паказвае статыстыка, у асноўным запазычанні бяруцца для таго, каб аказваць падтрымку рэальнаму сектару эканомікі. Часцей за ўсё для дапамогі сельскагаспадарчым арганізацыям.

Другая форма даўгавых абавязацельстваў — бюджэтныя крэдыты. Мясцовыя бюджэты могуць звярнуцца ў вышэйстаячыя. Сельвыканкамы — у раённыя. Бюджэтныя крэдыты бясплатныя. Аднак у якасці дысцыплінуючай меры Законам аб рэспубліканскім бюджэце на 2017 год прадугледжана прадастаўленне бюджэтных крэдытаў за плату (50% стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь) для тых аблвыканкамаў, чый доўг перавысіў параметры эканамічнай бяспекі. Ён выдзяляецца на фінансаванне часовых касавых разрываў. Я рэкамендую карыстацца такім інструментам. Дапусцім, калі ў раённым бюджэце ўзнікае разрыў — напрыклад, у маі-чэрвені вялікая частка педагогаў ідзе ў адпачынак. Ім трэба разава выплаціць вельмі вялікую суму адпускных выплат.

Трэцяя форма — патрабаванні банкаў, прад'яўленыя выканкамам, па выкананні гарантый. Выканкам можа даць гарантыю па крэдыце, які прадастаўляецца нейкай арганізацыі. І калі надыходзіць тэрмін плацяжоў па крэдыце, але прадпрыемства па якіх-небудзь прычынах не можа яго пагасіць, тады, у адпаведнасці з усталяванай працэдурай, банк звяртаецца да выканкама і ўжо прад'яўляе да яго як гаранта свае патрабаванні. У такім выпадку ўмоўны доўг трансфармуецца ў прамы.

***— Гомельская вобласць у нас самая паспяховая — у яе самы нізкі сукупны доўг рэгіёнаў. Як яна дамагласся такога ўзроўню?***

— Улады Гомельскай вобласці дэманструюць прыклад вельмі ўзважанай даўгавой палітыкі. Яны супастаўляюць бягучыя імгненныя выгады з наступствамі і не жывуць у доўг перад новымі пакаленнямі. З года ў год Гомельская вобласць альбо наогул не мае пратэрмінаванай крэдыторскай запазычанасці, альбо яна нязначная. Крэдытарская запазычанасць — гэта калі тавары, работы, паслугі ў бюджэтныя арганізацыі пастаўлены, але за іх яшчэ не разлічыліся. Сёлета ў Гомельскай вобласці бюджэт выконваецца напружана. Гэта абумоўлена тым, што знізіліся паказчыкі выніковасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці буйнейшых падаткаплацельшчыкаў — Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода і Беларускага металургічнага завода (Жлобін). І нават у такіх умовах яны вельмі рацыянальна накіроўваюць фінансавыя патокі.

Прынцыповай пазіцыі ненарошчвання даўгавой нагрузкі прытрымліваецца і Брэсцкі аблвыканкам. Яго доўг з'яўляецца мінімальным. Для параўнання, у 2016 годзе гадавы аб'ём выдаткаў на абслугоўванне доўгу ў Брэсцкай вобласці складае каля 5 млн рублёў, Віцебскай — 55 млн рублёў. І гэтая нізкая даўгавая нагрузка дазволіла абласному бюджэту Брэсцкай вобласці інвеставаць у новыя аб'екты будаўніцтва 103 млн рублёў за 11 месяцаў гэтага года, а Віцебскай вобласці — 64. На сёння цалкам вольныя ад даўгоў такія гарады, як Гомель, Гродна, Магілёў, Наваполацк і Жодзіна. А ў Мінску, Брэсце, Віцебску, Баранавічах, Пінску і Бабруйску доўг складае 1 — 3% прыбытку пры парогавым значэнні 80%. Гэта бяспечна для іх.

> Седзячы ў Мінску, не бачна, дзе трэба пабудаваць школу, а дзе — бальніцу. Мясцовым уладам лепш ведаць, куды выдаткаваць грошы.

***— Агульны аб'ём пратэрмінаванай запазычанасці па бюджэтных пазыках за дзевяць месяцаў 2016 года павялічыўся на 33,1 млн руб. Прадугледжаны нейкія штрафы за гэта?***

— Гаворка ідзе ў дадзеным выпадку пра запазычанасць прадпрыемстваў перад бюджэтам. Калі бюджэт заплаціў па выкананых гарантыях банку, цяпер прадпрыемства павінна бюджэту. Гэты доўг не прападае. Калі прадпрыемства не можа заплаціць банку, палітыка «бізуна» не працуе. Таму прыняты шэраг заканадаўчых актаў, згодна з якімі асобным групам прадпрыемстваў даецца адтэрміноўка і растэрміноўка ў пагашэнні гэтай запазычанасці перад бюджэтам. Але ўмовай іх прадастаўлення з'яўляецца тое, што льготны графік трэба выконваць абавязкова. Інакш ён спыняе сваю дзейнасць. Такі падыход паўплываў на тое, што з указаных 33 млн прыкладна 30 млн — у Гомельскай вобласці. Раней гэтая запазычанасць была бягучай у рамках ільготнага графіка. Гомельскі аблвыканкам працуе над гэтай праблемай. Штрафы таксама існуюць — пры нявыплаце ўключаецца «лічыльнік» за кожны дзень пратэрміноўкі. З выхадам Указа №106 ад 23 сакавіка 2016 года, які тычыцца дзяржаўных праграм і недзяржаўнай фінансавай падтрымкі, бюджэтныя пазыкі сталі аказваць толькі ў выключных выпадках па рашэнні кіраўніка дзяржавы.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

**Структура даходаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню (за 10 месяцаў 2016 года)**




# Экалагічных зваротаў усё больш

## *А бывае, даходзіць да суда*

**Спачатку цікавы факт пра Папу Рымскага. У Ватыкане падлічылі, якую шкоду наносяць навакольнаму асяроддзю яго палёты на самалёце. І, каб кампенсаваць страты, на беразе Дуная высадзілі 125 тысяч дрэў. Чым не прыклад для пераймання? Жыхароў нашай краіны таксама цікавіць тэма экалогіі. У прыватнасці, сёлета колькасць зваротаў у Віцебскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя павялічылася больш чым на 10%.**



## Чаму дрэвы высякаюць?

Бадай, адпаведная статыстыка (за 9 месяцаў) тыповая для краіны. З усіх прыблізна 190 зваротаў каля 70 датычацца высечкі зялёных насаджэнняў, навядзення парадку на зямлі, 30 — вывазу адходаў, больш за 20 — забруджвання вады...

— Што да высечкі дрэў, кустоўя, адпаведная працэдура, можна так сказаць, «заблытаная». Напрыклад, на прылеглым да дома ўчастку расце дрэва. Пасля разгляду пісьмовай заявы ў сельвыканкаме дазваляюць выдаліць «аб'ект расліннага свету». А потым іншы жыхар вёскі піша: "Навошта спілавалі, я ж саджаў!" Пачынаем разбірацца. Высвятляецца, што дазвол афармлены неналежным чынам, — тлумачыць **Тацццяна ЛАПАТКІНА, намеснік начальніка аператыўнага кантролю Віцебскага абласнага камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Нярэдка дзяржаўных эколагаў турбуюць па пытаннях, далёкіх ад парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. У прыватнасці, быў «сігнал» наконт непрыемнага паху з мясакамбіната. Маўляў, калі ў бок дамоў вецер дзьме, дыхаць няма чым. «Чужыя» пытанні звычайна пераадрасоўваюць у іншыя ведамствы...

## Сталіца — у лідарах

Дарэчы, у судзе можна абскардзіць адмову ў дачы экалагічнай інфармацыі. Разглядаюцца і справы ў абарону права на ўдзел у прыняцці экалагічна значных рашэнняў. Можна аспрэчыць дзеянні або бяздзейнасць грамадзян, органаў улады, якія парушаюць прыродаахоўнае заканадаўства.

— Адпаведнае прадугледжваецца Орхускай канвенцыяй. Яна гарантуе доступ да інфармацыі па пытаннях, якія тычацца навакольнага асяроддзя. Канвенцыя была ратыфікавана Указам Прэзідэнта №726 (14 снежня 1999 года). Уступіла ў сілу ў канцы кастрычніка 2001-га, — расказвае **Вольга ЗАХАРАВА, кіраўнік Орхускага цэнтра Рэспублікі Беларусь.**

Нядаўна ў Віцебску прадстаўнікі мясцовай улады, прыродаахоўныя інспекцый падзяліліся вопытам. Абмяркоўваліся пытанні выканання Орхускай канвенцыі. У тым ліку і супрацоўніцтва з людзьмі, якія клапоцяцца пра ахову прыроды. Некаторыя лічаць, што без суда тут ніяк. Цікава, што за 7 гадоў у судах краіны зарэгістравана больш за 30 адпаведных зваротаў. І больш за палову, як кажуць юрысты, разгледзелі, па сутнасці, 5 патрабаванняў у працэсе разгляду задаволілі.

Лідар па колькасці зваротаў сталіца — 13. Ёй саступае Мінская вобласць — 6. Па 5 — у Віцебскай і Гродзенскай абласцях, у Гомельскай — 2. А вось у Брэсцкай і Магілёўскай абласцях да прадстаўнікоў Феміды па экалагічных праблемах не звярталіся.

## З-за храма і... дрывасека!

Большасць судовых экалагічных спраў — 16 — датычацца праектаў гарадской забудовы: жылля і гэтак далей. Людзям, напрыклад, не падабалася перспектыва нейкага будаўніцтва побач з іх дамамі.

У Віцебску аж да суда дайшла спрэчка наконт магчымасці ўзвядзення ў парку копіі полацкага Сафійскага сабора (у першапачатковым выглядзе). У Пастаўскім раёне незадаволеныя прасілі не будаваць царкву і турыстычны комплекс каля возера...

Разглядалася і справа пастаўскага «дрывасека». Грамадзяне патрабавалі прыцягнуць да крымінальнай адказнасці юнака, які высек каля 10 дрэў на асабліва ахоўваемай прыроднай тэрыторыі. Але яго ўсё ж не прыцягнулі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** pukshanski@zviazda.by